

# Ваенны флэшмоб

***Тэатралізаваны дзень памяці «Па старонках ваенных часоў» прысвецяць ветэранам, былым вязням канцлагераў і работнікам тылу ў Гродне.***

— 7 мая пройдзе спецыяльная мультымедыйная прэзентацыя і тэатралізаванае прадстаўленне «Як пачыналася вайна», — паведаміў кіраўнік праекта «Жывая гісторыя» Сяргей Іваноў. — Пераапранутыя ў ваенную форму гродзенскія школьнікі і студэнты разам з работнікамі Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага з кветкамі ў руках сустрэнуць гасцей.

У час свята прагучаць аўдыязапісы з фондаў бібліятэкі: галасы дыктара Левітана і Сталіна, зварот маршала Жукава з нагоды Дня Перамогі, а таксама вядомыя песні ваенных гадоў. У гонар свята госці акцыі атрымаюць памятныя падарункі ад Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Беларускі фонд міру».

**Таццяна КАНДРАЦЬЕВА, «Р»**